Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 18 (400) Пятніца, 11 лютага 1927 г | Выходзіць тры разы на тыдню: у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвоная Зьмена» Менск, Комсам. 25.

Пачынаем агляд політшкол.

Ужо прашла першая палова навучальнага году комсамольскай сеткі політасьветы.

Зараз ужо можна і неабходна на падставе сабранага вопыту працы політшкол, політгурткоў праверыць, якія мы практычныя вынікі маем у галіне павышэньня дзёвай якасьці нашай політвучобы. Гэта праверка павінна быць праведзена на падставе дасканальнага абсьледваньня політшкол, політгурткоў, на падставе ўважлівага выяўленьня думкі ўсёй комсамольскай масы аб якаснай пастаноўцы політвучобы.

Дырэктывы аб такой праверцы працы былі ўжо даны Цэнтральным Камітэтам ЛКСМБ.

ЦК таксама даручыў рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена» правясьці на старонках газэты шырокае асьвятленьне працы політшкол і політгурткоў. Праводзімыя зараз у акругах абсьледваньні сеткі політасьветнай працы, як конфэрэнцыі па політасьвеце, бязумоўна, выявяць пажаданыя і адмоўныя бакі ў пастаноўцы політвучобы.

Вельмі важна забясьпечыць перадачу вопыту працы аднэй організацыі другой. Гэтую задачу ставіць перад сабою наша газэта, організоўваючы на сваіх старонках агляд працы політшкол і політгурткоў.

Настаўленая праца будзе поўнасьцю выканана, вядома толькі тады, калі кіруючыя ворганы саюзу і кіраўнікі політшкол прапагандысты жыва адгукнуцца на заклік газэты і забясьпечаць прыток конкрэтнага жывога матар'ялу, які малюе працу комсамольскай сеткі політасьветы.

Асабліва патрэбен удзел у гэтым аглядзе саміх вучняў. Іх думкі, конкрэтныя указаньні на недахопы—павінны аказаць нам вялікае садзейнічаньне ў устанаўленьні сапраўдных посьпехаў, а таксама і недахопаў, якія маюцца ў галіне якаснай пастаноўкі політвучобы.

На якіх асноўных пытаньнях павінны засяродкаваць сваю ўвагу агітпропы, пропколектывы, комсамольцы, якія дасылаюць матар'ял у газэту?

Вельмі важна высьвятліць, наколькі спраўляюцца з сваёю задачаю кіраўнікі політшкол, політгурткоў, наколькі ўмела і глыбока перадаюць яны веды комсамольцам.

Трэба высьвятліць, як глыбока ўспрыняты комсамольскай масай пастановы пленумаў ЦК УсеКП, 15-й партконфэрэнцыі; як пастаўлена самастойная праца комсамольцаў над павышэньнем політ'узроўню; як увязваецца прыпаднясеньне праграмы політасьветы з асьвятленьнем і растлумачваньнем асноўных пытаньняў політсучаснасьці, чарговых практычных задач у галінеэ гаспадарчай і грамадзкай працы саюзу; якая цікавасьць і актыўнасьць масы слухачоў у часе заняткаў; якая сувязь паміж ячэйкамі і політшколамі, зацікаўленасьць ячэек працай політшкол. Нарэшце, як апраўдала сябе ўнясеньне агульна-адукацыйных момантаў у працу політшкол, і што асабліва важна,—як ідзе вывучэньне беларускай мовы ў політшколах, якія практычныя вынікі маюцца ў гэтай галіне.

Вось прыкладна—група пытаньняў, асьвятленьне якіх павінна быць асабліва ўважлівым. Мы разьлічваем і спадзяемся, што рашэньні аб аглядзе на старонках газэты працы політшкол, сустрэне жывы водгук агітпропаў і пропагандыстых комсамольцаў і тым самым будзе забясьпечана пасьпешнасьць яго правядзеньня.

Політыка браніраванага кулака

3 хворае галавы на здаровую

Тав. Літвінаў, намесьнік Народнага Камісара Замежных Спраў, выступіў з заявою ў сувязі з шаленай антысавецкай кампаніяй, якую зараз вядуць ангельскія «цьвердалобыя» консэрватары, на чале з кіраўнікамі ангельскага ураду.

Непасрэднай прычынай гэтае траўлі савецкай краіны з'яўляюцца тыя няўдачы якія ангельская дыплематыя за апошні час пацярпела ў Кітаі. Да гэтага часу ангельскія консэрватары прывыклі адносіцца да Кітаю, як да свае калёніі, прывыклі да паслухмянасьці кітайскіх падняволеных і раптам цяпер кітайскія падняволеныя загаварылі языком гаспадароў свае краіны.

Надпісы, якія з даўных часоў віселі на варотах ангельскай концэсіі ў Кітаі і якія гаварылі—«уваход сабакам і кітайцам забаронены», заменены надпісамі: «уваход ангельцам і сабакам забаронены». Працоўныя Кітаю, заявілі свае правы на концэсіі. А калі Ангельшчына паспрабавала пад пагрозаю аружжа заставіць нацыянальны Кантонскі (цяпер Уханскі) урад падпісаць з ёю згоду міністр замежных спраў нацыянальнага ураду Аўгэн-Чэн заявіў: «Напершае выведзьце свае вайсковыя караблі і дэсанты, а потым будзем весьці перамовы і падпісваць згоду».

Ёсьць з-за чаго прыйці аж да шаленства ангельскім консэрватарам. Становішча ў Кітаі незавіднае, да і ў сябе дома ня усё добра.

Як тут ня зваліць віну з хворай галавы на здаровую. Ангельскі міністр унутраных спраў Хікс заявіў, што «Савецкі ўрад, у значнай меры, адпаведны за народны рух супроць ангельцаў у Кітаі». Астатнія «цьвердалобыя» хорам патрабуюць разрыву дыплёматычных і гандлёвых зносін з СССР.

«Ангельскія консэрватыўныя колы,—заявіў тав. Літвінаў,—сваю ўласную памылку зараз стараюцца зваліць на Савецкі ўрад, спрабуючы рабіць яго «казлом адпушчэньня», на падставе сьмехатворных легенд, якія тлумачаць найвялікшы ў гісторыі вызваленчы рух шматмільённага Кітаю «махінацыямі» савецкіх «агэнтаў».



Белы тэрор.

Нязвычайны разгул фашысцкай пілсудчыны.

Вязьні—беларусы вывозяцца ў Галіцыю.

Гэтымі днямі вывезена з віленскае турмы Лукішкі ў Станіславаў (Галіцыя) партыя політычных вязьняў, якія прымалі ўдзел у апошняй галадоўцы вязьняў на Лукішках.

Сярод вывезеных—шмат беларускіх вязьняў: б. рэдактар беларускай газэты Мікола Шыла, Арсень Канчэўскі і шмат іншых.

Душаць нават беларускія протэсты.

У ночы з 21-га на 22-ае студзеня была ўзьнята трывога ў Горадзенскім гарнізоне.

81-шы полк пяхоты ў поўнай баявой гатоўнасьці стаяў усю ноч перад казармамі. Трывога была ўзьнята з прычыны таго, што ў гэтую ноч спадзяваліся беларускае дэмонстрацыі-протэсту проціў арышту беларускіх дэпутатаў.

Арыштаваныя дэпутаты грамадаўцы выданы соймам суду.

Гучная обструкцыя на пастанову сойму.

Польскі сойм ухваліў выдаць суду арыштаваных беларускіх дэпутатаў і дэпутата незалежнае сялянскае партыі Галавача.

Выйікі галасаваньня нацыянальныя меншасьці і комуністыя спаткалі бурнай обструкцыяй. Частка лявіцы ад галасаваньня ўстрымалася. Проці выдачы галасавалі крайняя левая партыя, нацыянальныя меншасьці і ППС. Дэпутат Гумінскі, сябра клюбу працы, галасаваў проці выдачы і выступіў з клюбу.

Канчатковыя вынікі галасаваньня былі спатканы бураю протэстаў і обструкцыяй.

З лавак нацыянальных меншасьцяй пачаўся выгук: «У гэтую хвіліну Польшча перакасавала сваю конституцыю і страціла свае ўсходнія крэсы».

У ЛАПАХ ЯСНАВЕЛЬМОЖНАГА пана ПІЛСУДЗКАГА

Жыцьцё і барацьба польскага комсамолу.

Умовы, у якіх вёў барацьбу комсамол Польшчы да перавароту Пілсудзкага, былі вельмі цяжкімі.

Калі ўся рабочая кляса, уся рабочая моладзь падлягалі самым цяжкім рэпрэсіям, былі пазбаўлены вольных сходаў і слова, бязьлітасьна расстрэльваліся пры спробах організаваць вулічныя дэмонстрацыі ў абарону сваіх правоў—і комсамол рэволюцыйны авангард рабочай моладзі быў пазбаўлены правоў.

Звыш тысячы комсамольцаў сядзелі за кратамі, прыгавораныя к доўгім гадам катаржнай турмы, а якія засталіся на волі вялі ў глыбокім падпольлі сваю працу на фабрыках, шахтах і вёсках.

Многа згінула, забітыя па прыгавору ваенна-палявых судоў, некаторыя знашлі сьмерць у бойцы, не захацеўшы аддаць сябе на зьдзекі паліцыі (напрыклад, таварышы Хайчык і Пілярчык, якія адстрэльваліся ў працягу 7 гадзін ад паліцыі і задушаны ўдушлівымі газамі). Многія памерлі пад палкамі або ад «электрафікацыі» ў ахранцы або аддавалі сваё жыцьцё ў шматлікіх галадоўках у турмах.

Але праца вялася бязупынна. На месца вырваных з комсамольскага строю прыходзілі новыя маладыя байцы. Аўторытэт, сіла КСМП расьлі. З'організаваны на аснове фаб'ячэек, польскі комсамол сумеў устаяць супроць усіх рэпрэсій.

Грубейшая памылка компартыі і комсамолу

І калі ў маі 1926 году ў Варшаве загрымелі гарматы Пілсудзкага, якія білі па войсках рэакцыйнага ўраду Вітаса—КСМ Польшчы чуць не ў адзін дзень перастроіў свае падпольныя ячэйкі ў баявыя «дзясяткі», узброіў сваіх сяброў, прызваў рабочую моладзь да ўзброенай барацьбы супроць ураду Вітоса, да маральнай і матар'яльнай падтрымкі Пілсудзкага.

Гэта была грубая, опортуністычная памылка, якую нельга дараваць, і якую КСМ Польшчы зрабіў у сьлед за компартыяй Польшчы. Падтрымоўваючы ўзброеную руку Пілсудзкага, польскія комуністы і комсамольцы думалі, што падтрымоўваюць справу рабочых і сялян, думалі, што Пілсудзкі пачаў першы дэмократычны этап рэволюцыі, што перамога Пілсудзкага—гэта перамога «дробна-буржуазнай дэмократыі» над рэакцыйнай буйнай буржуазіяй.

Гэта была вялізарная памылка. Няма і ня можа быць у Польшчы рэволюцыі ў інтарэсах пролетарыяту, на чале якой не стаяла-б компартыя. Няма і ня можа быць агульнага шляху з заклятым ворагам СССР—Пілсудзкім.

Масавыя самагубствы моладзі.

КСМ. Польшчы зразумеў ужо сваю памылку і з усёю сілаю павярнуў свой фронт супроць Пілсудчыны, супроць навазьяўленага польскага фашызму.

Становішча пролетарыяту ў Польшчы пасьля перавароту Пілсудзкага рэзка пагоршылася. Эксплёатацыя рабочай моладзі дашла да нячуваных разьмераў, за жабрачы заработак 7—8 рублёў у месяц працуюць маладыя хлапцы і дзяўчаты, часта дзеці 10 гадоў па 10, 12, 16 гадзін у дзень.

У тэкстыльнай вытворчасьці, калі да перавароту рабочы працаваў пры 2—4 верацёнах, дык цяпер ён працуе пры 8, 10, 12. Маладых гарнякоў выносяць абамлеўшых з шахт, пасьля непасільнага 16-часавога працоўнага дню.

За малейшую віну, за памарку на тавары, за словы або жэст абурэньня, бярэцца грашовы штраф, або проста звальняюць з фабрыкі. А за фабрычнымі варотамі сотні-тысячы беспрацоўных.

Асабліва цяжкае становішча рабочай моладзі, якая не адтрымоўвае ніякае дапамогі. Ня дзіва, што кожны дзень мы чытаем у польскім друку доўгі шэраг маладых самагубстваў.

Прыгоньніцтва для падлеткаў.

Але фашысцкаму ураду Пілсудзкага, гэтага мала. Некалькі нядзель таму назад выпрацаваны законапроэкт, які аддае рабочую моладзь у неабмежаваную кабалу прамыслоўцам і майстрам. Вось некалькі «красачак» з гэтай гнуснай ўрадовай прапановы.

1) «У працягу трох месяцаў (пасьля прыёму на працу) вучня можна ў любы час звольніць. Але вучань пасьля працягу трох тыдняў ня мае права пакінуць свайго прадпрыемцу ні ў якім разе, бо ў працягу году няможна прыняць зноў вучня ў навучэньне, калі першы яго прадпрыемца ня дасьць на гэта свае згоды».

2) «Вучні, што ня прызнаюць пастаноў, якія іх датычацца, караюцца штрафам або арыштам да 14 сутак».

— Кару вызначае нават ня суд, а адміністратыўна-прамысловыя колы інакш кажучы самі гаспадары.

Арышты па ўсёй краіне.

Ня дзіўна, што рабочая моладзь з агідаю адварочваецца ад ураду Пілсудзкага і ад соцыял-дэмократычных юнорганізацый, якія падтрымоўваюць «пана маршала».

Ня дзіўна, што шэрагі Комсамолу папаўняюцца ўсё новымі кадрамі рабоча-сялянскай моладзі, што на прызыў да барацьбы за зьнішчэньне крывавай фашысцкай дыктатуры з усіх куткоў Польшчы, — з фабрык, шахт, панскіх маёнткаў, з казармаў,—масаю адгукваецца моладзь з перакананасьцю з надзеяй устае пад комсамольскія сьцягі.

Пілсудчыкі з бясьсільнай злосьцю глядзяць на падымаючуюся рэволюцыйную хвалю. Шматлікія банды ахраньнікаў і паліцэйскіх вылаўліваюць «крамольнікаў».

Ужо больш двух тыдняў падрад ідуць па ўсёй Польшчы масавыя арышты. Тысячы рабочых і сялян, хлопцы і дзяўчаты папаўняюць турмы. З ахранкі чутны разьдзіраючыя душу крыкі політарыштаваных, якіх катуе паліцыя.

Палкаю, турмою і кулею хоча фашызм «супакоіць» рабочых і сялян, Нязвычайнымі законамі супроць комуністых і комсамольцаў хоча фашызм ператварыць рабочую клясу Польшчы ў сьляпую маўклівую зброю, і тады можна будзе спакойна пачаць выконваць сваю мэту—мэту Пілсудзкага і ўсіх міжнародных імпэрыялістаў.

Да вайны супроць СССР.

Але компартыя і комсамольцы Польшчы на пагрозы разьюшаных паноў могуць з перакананасьцю адказаць:

Рукі кароткія! Усіх не перастраляеце! Усіх не пераарыштуеце. Ня гледзячы на ўсё вашыя патугі, ня гледзячы на тысячы прысланых шпікаў і правакатараў, ня гледзячы на здрадніцтва соцыял-дэмократаў, ня гледзячы на турмы і пыткі ахранкі.

Компартыя і Комсамол Польшчы вядуць і будуць весьці рабочыя масы да пераможных бояк за рабоча-сялянскую справу!

Канецкі.

(Сябра ЦК Польскага Комсамолу).

Чаму сёньня няма фэльетону.

Вы думаеце ня ўмеючы лёгка напісаць фэльетон? Ого, браточкі! Гэта вам не таварышча абгабляваць і ня пельку ў лёдзе прасеч.

Напісаць, то напісаў-бы, бачыце пісаць, хоць няграматна, але ўмееш чалавек. Вучыўся-ж зім са тры, як кажуць суседзі. Але падумаеш аб тым, якое ўражаньне твой фэльетон зробіць на чытача—дык у галаве зробяцца сапраўдныя фашысцкія перавароты, а ў сэрцы ня рытмічныя выстукі, а стрэлы Пілсудзкага па Беларускай Грамадзе.

— Ня верыце?—Спрабуйце і пераканаецеся.

. . . .

Атрымаў я заданьне ад рэдакцыі—«Хоць памры, а ў чарговы нумар фэльетон павінен быць».

Прашуся, каб зьнялі з мяне гэтае «суровае адмежаваньне», бо часу няма, ды к таму тэмы... Ня высмакчаш-жа з пальца!

І яшчэ нешта прыводзіў я ў якасьці «уважлівых прычын», але сакратар рэдакцыі парадаваў мяне новым:

— Ты знаеш, што такое «нярыпайся»?

— Хай табе, думаю, у каленцах рыпае! Панавучваліся-ж рознай трасцы, дык і слоўца супроць не скажы... Але што зробіш?—

... Нярыпайся!

Прышоў дамоў. Пісаць?—Што ты будзеш пісаць. Узяўся чытаць «Чырвоны Сейбіт». У вершы **М. Грамыкі** вычытаў, як ён зьбіраецца закідаць ангельцаў з іх вялізнымі гарматамі беларускімі сьнежкамі. Ну што-ж, мае поўнае права, ды яшчэ дзякаваць маёй гаспадыні (печку нажарыла), адлега на двары!..

І не напішаш-жа аб гэтым фэльетон. Ня маем права падрываць сьмеласьці! у чалавека. Хай ваюе, а можа і ўдасца яму так стукнуць ледзяністаю сьнежкаю ў нюхаўку Чэмбэрлена, што той забудзецца і пра Кітай...

Але што мне да Чэмбэрлена! Мяне фэльетон гвалціць... Рады няма. А ў галаве—як у рэшаце: нічагуткі не «соображает».

Адзяваюся і іду на Менскі каток значыцца, шукаць тэмы і набірацца натхненьня. Прыходжу. Там хлопцы скардзяцца, што канькі маленькія, бацінкі парваныя, няма чым ні прыкруціць ні прывінціць. Другія аблізваюць губы і злуюць на культаддзел ЦСПСБ, што ніякага буфэту ня прыдумае, і дабаўляюць—«і ніхто ў газэтку не тавос».

—Гэта ўжо, думаю сам сабе знадцішка, пра пісаньне! Скуру напісаць такім ёмкім. Цікава каму будзе чытаць, што на катку няма на чым катацца. Што вы маленькія, у гульні гуляць, ці якое ліха! Забудзьце, таварышы, пра канькі! У нас ёсьць больш важныя пытаньні і нечага каткамі адцягваць увагу ад сусьветнай рэволюцыі.

Што-ж' не напішаш пра каток. Пачытае бацька ў вёсцы і скажа: вот сукіны сыны, няма чаго рабіць, дык падмёткі лупяць...

Пакідаю каток. Іду ў горад. Заходжу ў коопэратыў. Народу, як у кіно «Культура». Тры чаргі стаіць.

І ў кожнай чалавек па сотні. Стаў і я. Прыбягае некая жанчына і зразу да касы. Канечна, мы парадак знаем і не дазволілі ёй выпісаць сто грам хлебу (больш нішто ёй не патрабавалася).

Стаяў—стаяў ажно, як прыслухаўся, дык ногі пачынаюць балець.

Гляджу на гадзіньнік — паказваюць 12. А прышоў у коопэратыў у 11. І яшчэ прыдзецца з паўгадзіны, або хвілін трыццаць пастаяць.

Стаяў і чакаў.

Чакаў і думаў пра фэльетон. Тэма не раджалася.

...Гадзіна ночы. Сяджу і думаю пра фэльетон. Думаю і шукаю тэму. Знашоў! Тэма пра п'янства і хуліганства.

І, прызнацца, цікавая!

Пра Ракашэнскую ячэйку (Узьдзенскі раён), пра яе комсамольца Бусла і пра яго калядную вайну ў вёсцы Сакольшчыне. Факт сам ужо ня так і цікаў, але ў Бусла быў вельмі новы шворань!

Пра хуліганаў ужо пісалася. Нават фіксіраваліся іх «морды», так што паўтарацца нельга.

А час бяжыць. Ужо дзьве гадзіны. Трэба класьціся спаць...

— А фэльетон?

— Фэльетон... тон... Гэта вам не тапарышча!

...Вось таму сёньня «Зьмена», без фэльетону...

Зьм. Гарошын.



Хутка пачынаем агляд працы палітшкол

Агляд праводзім на старонках газэты. Умовы надрукуем у адным з чарговых нумароў.

З агнём не адшукаеш.

Наогул працуем добра.

(г. Клімавічы).

25-га кастрычніка распачала сваю працу наша палітшкола. Яна была укомплектавана моладзьдзю маючай агульную асьвету ня ніжэй чым за 3-х гадовую вячэрнюю школу рабочай моладзі. З 106 чалавек слухачоў школы, толькі 3 чалавекі з ніжэйшай асьветай.

Заняткі ў школе праводзяцца лябараторным мэтодам, так што з ніжэйшай асьветай было-б цяжка працаваць. Такі надбор вучняў дае мажлівасьць нормальнаму правядзеньню заняткаў і ад гэтага атрымоўваюцца добрыя вынікі.

Адна бяда у працы школы гэта недахоп належнай літаратуры. Увесь час нам абяцалі, што зараз-жа прышлюць належныя падручнікі, але і да гэтага часу іх нявідаць. Мабыць абяцанка і застанецца абяцанкай.

Прыходзіцца да кожных заняткаў шукаць па ўсім бібліотэкам, каб знайсьці, які небудзь падручнік. Але ўсё-ж такі вучні да заняткаў падрыхтоўваліся і яны праходзілі добра.

Перад канікуламі была праведзена пісьмовая праца і вечар вучобы на якім вынесены былі характэрыстыкі па першаму трымэстру. З 60 чалавек 22 напісалі добра пісьмовую працу, 32 здавальняюча і 6 слабавата. Гэта ўжо поўнасьцю паказвае, што праца ў школе вялася добра, што вучні да заняткаў адносіліся сьвядома.

Трэба спадзявацца, што і ў далейшым заняткі ў школе будуць ісьці, як належыць.

Сінельнікаў.



За год--два разы займаліся.

(Горкі, Аршаншчына).

За ўвесь час існаваньня нашай палітшколы былі праведзены толькі два разы заняткі, на якіх прысутнічалі замест 30—14—16 чалавек, а ў 3-ці раз на заняткі прышло 7 асоб і з тых пор палітшколы як і ня было.

АПО райкому па гэта і не зьвярнула ўвагі, быццам-бы яго гэта не датычыцца. Усё-ж такі працу ў палітшколе трэба распачаць, бо маецца шмат комсамольцаў, якія жадаюць вучыцца, жадаюць набыць сабе палітычныя веды.

Зімні пэрыод ужо на зыходзе. Трэба як хутчэй ўзяцца за аднаўленьне працы ў палітшколе.

Комсамолец.

Кругом недахопы.

(М. Талочын, Аршаншчына).

З боку многіх комсамольцаў, якія займаюцца ў нашай палітшколе, наглядаліся нядбайныя адносіны да заняткаў. Адзін комсамолец, прымацаваны да палітшколы, ніводнага разу не зьявіўся на заняткі, а другі прапусьціў 9 раз. Ёсьць і яшчэ некалькі хлапцоў, якія не наведвалі рэгулярна заняткі палітшкол.

Было некалькі выпадкаў і зрыву заняткаў па прычыне адсутнасьці газы, лямпы і г. д. Памяшканьне часта не атаплялася. Усе гэтыя прычыны не маглі спрыяць выкананьню поўнасьцю вучэбнага пляну.

На занятках комсамольцы сябе трымалі вельмі дрэнна, займаліся іншымі справамі, а актыўнага ўдзелу у разборы таго ці іншага пытаньня ня прымалі. Праўда, віною гэтаму было і тое, што кіраўнік гуртка меў слабую падрыхтоўку, ён ня мог зацікавіць слухачоў.

Вялікай перашкодай ў працы школ была адсутнасьць літаратуры.

З гэтай прычыны заняткі праводзіліся не па програме, вывучалі толькі тое, па чым былі падручнікі.

Нічога ня зроблена палітшколай і ў галіне беларусізацыі. Заняткі праводзіліся выключна на расійскай мове, нават тыя комсамольцы, якія на сходах і ў штодзённым жыцьці гавораць пабеларуску, у палітшколе лічылі сваім абавязкам выказвацца на расійскай мове. У кіраўніка палітшколы першай ступені тав. Шапіра склаўся такі погляд, што беларускую мову трэба ўжываць дзе небудзь у іншым месцы, але толькі не ў палітшколе.

Вось якое становішча мы маем у працы нашай палітшколы.

Міх. Зак.

Газы--і той не даюць!

(Лепель, Барысаўшчына).

Наша палітшкола да заняткаў прыступіла ў канцы лістапада месяцу 26 г. Ею ахоплена 23 чалавекі.

Кіраўнік добра падрыхтаваны і ён змог цікава паставіць працу. Заняткі праводзяцца шляхам гутарак, што выклікае вялікую актыўнасьць у разборы таго ці іншага пытаньня. Праўда, гэтаму крыху перашкаджаў ня зусім удалы склад слухачоў.

Акрамя грамадазнаўства ў в е д з е н ы яшчэ і два агульна-адукацыйных прадмэты.

За гэты час 2 разы займаліся па беларусазнаўству, заняткаў па прыродазнаўству ня было з прычыны адсутнасьці настаўніка.

Асноўным недахопам зьяўляецца адсутнасьць падручнікаў, дрэннае матар'яльнае становішча. Нават закупку газы прыходзіцца рабіць у складчыну! Але нічога. У далейшым, мы спадзяемся, праца нашай школы падымецца на належную вышыню.

Міцкевіч.

Баня ці палітшкола?

(Ф-ка «Чырвоная Бярэзіна», Нова-Барысаў).

За апошні час наглядаюцца вельмі дрэнныя адносіны нашых комсамольцаў да палітвучобы. Калі раней, у пачатку зімы, наведвала школу каля 70 проц., дык цяпер маем усяго 35-40 проц.

Прычынай дрэннага наведваньня зьяўляецца новы колдагавор... Справа ў тым што па гэтаму колдагавору ўсім рабочым 2 разы ў месяц прадстаўляецца магчымасьць наведваць баню. Наведваньне бані прыпала як раз на той дзень, калі ў нас павінны быць заняткі ў палітшколе.

Дрэнна яшчэ і тое, што ў саміх комсамольцаў ёсьць шмат «дзіцячых хвароб»: то нага баліць, то рука, то зуб і г. д. і ўрэшце на заняткі ня ходзяць! У час заняткаў хутчэй пойдуць у кіно, або блытацца па вуліцы...

Трэба бюро ячэйкі зьвярнуць на гэта самую сур'ёзную ўвагу і ў хутчэйшы час наладзіць наведваньне палітшкол. Акрамя гэтага трэба дагаварыцца з культкамісіяй фабкому, каб далі для палітшкол чорныя дошкі, бо на белых, якіх яны нам прыслалі, пісаць нельга.

І, бязумоўна, трэба, як найхутчэй вырашыць «баннае пытаньне»!

С. Клопаў.

ЗВЫЧАЙНАЕ.



Дакладчык разгарачыўся.

На Менскай конфэрэнцыі ЛКСМБ

ШТО КАЗАЛІ ДЭЛЕГАТЫ ПА СПРАВАЗДАЧЫ ЦК

У спрэчках па дакладу тав. Бараньнікава выказалася каля 28 чалавек.

Дэлегаты ў спрэчках спыняліся ўсіх пытаньнях комсамольскай працы.

Піонэрская праца кульгае.

Актыў—слаб.—Выхаваўцелі ў дзіцячых дамох дрэнныя.—У піонэр-клюбе займаюцца не піонэры—а... фізкультурнікі.

Тав. Палонскі—кажа, што ЦК мала зьвяртаў увагі пытаньню піонэр працы.

У дзіцячых дамох пэдагогічны пэрсонал ня добра падабран, адсутнічаюць падрыхтаваныя піонэрпавадыры. Трэба дабіцца добрых выхаваўцеляў і павадыроў у дзіцячых дамох.

Дзеці спэцыялістых не абхоплены піонэр-арганізацыяй. Гэта тлумачыцца тым, што было зьвернута мала ўвагі, і тым што бацькі-спэцы ня пускаюць сваіх дзяцей у атрады. У школе дзеці спэцаў трымаюцца асобна і настаўніцтва інакш адносіцца да гэтых дзяцей.

Тав. Аляс—профсаюзы не даюць грошы ня гледзячы і на пастанову ЦСП

Нам далі піонэр-клюб, а ў ім займаюцца фізкультурнікі а не піонэры.

Нам патрэбна пачаць працу сэмінарыяў піонэр-працаўнікоў.

Тав. Грынкевіч. (Заслаўль)—піонэратрады на вёсцы працуюць у вельмі дрэнных умовах. У горадзе ёсьць нарада чуць ня кожнага піонэра пасылаюць курсы, а на вёсцы інакш.

Шчыльней да гаспадарчага будаўніцтва!

Распаўсюджым добрыя пачынаньні.—«Ня раз у год, штодзённа».—Выжывем разнабоі.

Тав. Садоўскі. (Койданава).—Ёсьць некаторыя добрыя пачынаньні комсамольскіх ячэек і паасобных гаспадароў-комсамольцаў, але яны ёсьць толькі пачынаньні. Самастойны гаспадар комсамолец зьяўляецца ў большасьці бедняком і на сваіх 3-4 дзесяцінах зямлі многа чаго ня зробіць. Нашы комсамольцы, самастойныя гаспадары ня могуць перайсьці на пасёлкі з-за адсутнічаньня сродкаў, а комсамольскія ячэйкі ім у гэтай справе не памагаюць. Мы прывыклі на сходах ячэек КСМ абгаварваць раз у год конкрэтныя пытаньні па падняцьцю сельскай гаспадаркі. Трэба ў далейшым каб ячэйкі больш займаліся пытаньнямі сельскай гаспадаркі, трэба каб ячэйкі ўзяліся за справу кіраўніцтва комсамольскімі гаспадарамі.

Апрача гэтага, існуе разнабой у гаспадарчай працы паміж ячэйкамі і сельсаветам.

Культурна-масавая праца.

Аб акраінных вячорках.—Не пасьпяваем за запатрабаваньнямі жыцьця.—Масавая праца на яўрэйскай мове слаб

Тав. Рамізевіч (Ляхаўка). Многія т.т. баяцца наладжваць вечарынкі. Акраінныя вечарынкі трэба наладжваць і комсамольцы павінны ісьці туды не асобна, а організована, бо вядома, што нашы комсамольцы на гэтыя вечарынкі ходзяць «тайком», скрываючы свой комсамольскі твар. Нашы літаратурныя аб'яднаньні мала зьвяртаюць увагі на ўдзел саюзнай працы, не жадаюць дапамагчы і даць указаньні нашым юнсэкцыям у іхняй працы.

Тав. Гурвіч Ц. (Ак). У галіне культурна-масавай працы, трэба сказаць, што нашы кіраўнічыя органы часта не пасьпявалі за запатрабаваньнямі жыцьця. У нас няма літаратуры па гэтаму пытаньню. Адсутнічае сувязь з культаддзеламі раёнаў.

Тав. Шлямбэрг. Масавая праца на яўрэйскай мове слаба пастаўлена.

Саюзныя дні праходзяць мёртва аб вестка няцікавая.

Вопыт нашай ячэйкі кажа, што можна правесьці іншы раз на саюзным дню чытку мастацкай літаратуры, прысьвечанай тым ці іншым пытаньням і здарэньням.

Тав. Комар. (Зап. чыг.) ЦК дастаткова цікавіўся пытаньнем пра сярод моладзі на транспарце.

Неабходна больш уважліва адносіцца да працы сярод рабочай моладзі на транспарце, колькасьць якой вызначаецца калькімі тысячамі.

Тав. Пасюкоў. Калі раней у ісьці на вечарынку, скакаць і г. д. чылі мяшчанствам, дык цяпер становішча зьмянілася.

Тав. **Шапавалаў**—Ня трэба ўсю ну за недахопы ў культпрацы ўсклад на ЦК. Тут шмат вінаваты і нашы ор нізацыі на мясцох, якія не скарыстоўваюць усіх магчымасьцяй (комсамольскі друк, кнігі і г. д.)

Тав **Фрыд**—Наведваньне ўсімі комсамольцамі вясковых вечарынак, нічога д рага ня дасьць, бо нашы комсамольцы большасьці слабыя, ня змогуць правесьці сваёй лініі. Лепш комсамольскай ячэйкі організоўваць свае вечарынкі, куды пр цягваць сялянскую моладзь.

Нацыянальнае пытаньне

Тав. **Садоўскі** (Койданава). У некаторай частцы організацыі ёсьць думка аб тым. што нац. політыка гэта ёсьць толькі пераход на беларускую мову. Трэба зьвярнуць у далейшым увагу на растлумачваньне у нашай організацыі пытаньняў нац. політыкі партыі.

Тав. **Зэйфман** (Ляхаўка). У нас у Комсамоле ёсьць тып комсамольца, які выступае і кажа, што ў нас ёсьць беларускі вялікадзяржаўны шовінізм, а на справе зьяўляюцца шовіністамі.

Тав. **Зельдзін**. Нац. пытаньне оас часам, праводзіцца казённа, у бо шасьці выпадкаў выражаецца ў пісан протоколаў. Трэба праводзіць шырок растлумачвальную працу ня толькі ся моладзі, але і сярод дарослых рабочых.

Дзёньнік конфэрэнцыі.

У спрэчках па справаздачы АК выказалася каля 60 чалавек (з запісаўшыхся 98).

Спрэчкі занялі ўсё вячэрняе пасяджэньне 7 лютага і частку раніўняга пасяджэньня 8 лютага, якое было закончана заключнымі словамі дакладчыкаў.

На вячэрнім пасяджэньні 8 лютага быў заслухан даклад тав. **Рубіна**, аб працы сярод рабочай моладзі.

Спрэчкам і заключнаму слову дакладчыка, было аддана ўсё раніўняе пасяджэньне конфэрэнцыі 9-га лютага.

Днём працавалі камісіі па выпрацоўцы рэзолюцыі па дакладам.

На вячэрнім пасяджэньні прыняты рэзолюцыі і адбыліся выбары новага складу АК.

Рост Менскай організацыі ЛКСМБ.

(Канец. Пачатак глядзі ў папярэднім нумару).

Побач з вялікім ростам прыкмячаецца і цякучасьць організацыі.

На грунце недастатковай організацыі кіраўніцтва ўзросшай актыўнасьцю рабоча-сялянскага маладняку, як знаходзячагася ў шэрагах комсамолу, так і ўпе яго і на грунце некаторай супярэчнасьці нядшага сучаснага разьвіцьця (абсолютны рост прыватна-капіталістычных элемэнтаў, безпрацоўе, простытуцыя і г. д.) растуць хворыя зьявішчы сярод моладзі (п'янства, хуліганства, палавое распутства) за якія выключана 114 чалавек, што складае 1,4 проц. адносна ўсёй організацыі.

Значная колькасьць добраахвотных і мэханічна выбыўшых (апошнія можна чыць скрыта-добрахвотнымі) галоўным нам на грунце нездавальненьня прац не дастатковай не прыстасаванасьцю асобных груп комсамольцаў.

Дзеля гэтага пытаньням цякучасьці організацыі конфэрэнцыя павінна адд сур'ёзную ўвагу.

Апошняе пытаньне, якое патрабуе рэктывы акр. конференцыі—уцягненьне Саюз рабочага юнацтва.

Дзякуючы непрыстасоўванасьці вадзімай намі працы (асабліва эконом най) да гэтай часткі моладзі, юнацтва слаба прасэўваецца ў комсамольскую ганізацыю.

Д. Садоўскі.

Усебеларускаму краязнаўчаму зьезду--прывітаньне!

У чацьвер, 10-га лютага, распачаў працу другі ўсебеларускі краязнаўчы зьезд

Працоўная моладзь павінна ведаць краіну, у якой яна жыве!

Паміж першым і другім зьездам прайшоў цэлы год. Мінулы год быў вельмі пладавітым годам. Краязнаўчая справа значна вырасла. Лік організацый у цяперашні момант даходзіць да 2-х з палавай сотак, лік сяброў да 9 тысячаў. Гэта дае 100 проц. росту. ЦБК, (Цэнтральнае Бюро Краязнаўства) як організацыя, існуючая пры Інбелкульце, дала яму шмат каштоўных матар'ялаў, якія цяпер апрацоўваюцца ў камісіях і сэкцыях яго. Інбелкульт ня можа паскардзіцца на ЦБК, што яно ня выконвае сваіх абавязкаў. Але можна сказаць адваротнае. ІБК не на ўсе 100 проц. выкарыстаў і апрацаваў матар'ялы, якія былі яму дадзены краязнаўчымі організацыямі. Самадзейнасьць мас так разьвінулася, што за ёю не пасьпела праца Інбелкульту і ў першую чаргу моладзь.

Зразумела, што і цяпер шмат яшчэ працы ляжыць перад краязнаўствам. Трэба разьвінуць працу ў Гомельскай і Рэчыцкай акругах, каб там краязнаўчая сетка разьвінулася з такой самай гушчынёй, як і ў іншых акругах. Трэба наўсямесна спусьціцца яшчэ глыбей да масаў і дайсьці да сельсаветаў. Пакуль што рабочы і сялянскі актыў яшчэ слаба ўцягнут у краязнаўчую працу. Нізавыя гурткі ў вёсках дапамогуць дайсьці да сялянскага актыву і ўцягнуць яго ў краязнаўчую працу. Тое самае трэба зрабіць і ў адносінах да рабочага актыву.

Ужо распачалася вельмі карысная праца па вывучэньню паасобных раёнаў. Гэту працу трэба весьці і далей. Ня вывучыўшы раёнаў, немагчыма вывучыць дэтальна і Беларусі. А бяз вывучэньня Беларусі немагчыма з посьпехам адбудоўваць яе гаспадарку і культуру. Трэба імкнуцца, каб у кожным раёне быў утвoран краязнаўчы музэй, які павінен зрабіцца тым асяродкам, каля якога будуць концэнтравацца мясцовыя краязнаўчыя сілы. Апроч таго, музэй будзе культурным асяродкам наогул усяго раёну. Можа ў пачатку гэты раённы музэй будзе слабы і бедны, але з цягам часу ён абагаціцца, разрасьцецца і ўпарадкуецца. Ён будзе і дапаможнікам у працы і паказальнікам яе адначасова.

Пакуль што яшчэ ня так добра, як трэба, разьвінулася праца па вывучэньню жыцьця нацменшасьцяй Беларусі. Пачатак працы ўжо паложан на аснове пастановаў леташняга краязнаўчага зьезду, які з увагаю аднёсься да гэтага пытаньня. Другому зьезду яшчэ раз трэба дэтальна абмеркаваць пытаньне аб вывучэньні нацменшасьцяй, каб паглыбіць, дэталізаваць і пашырыць працу ў гэтым напрамку. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на вывучэньне мястэчка, якое перажывае зараз вельмі цікавую эпоху і якое іграе даволі выдатную ролю ў жыцьці Беларусі.

Зьезд, судзячы па абвестцы, будзе строга дзелавым. Мы запэўнены, што зьезд вырашыць пастаўленыя пытаньні ва ўсёй іх шырыні і глыбіні. Компартыя і с а в е ц к а я ўлада адбудоўваюць краіну. Бязумоўна, ІБК і ЦБК з яго організацыямі ў гэтай адбудове дапамогуць ім усімі сваімі сіламі. Пад кіраўніцтвам компартыі мы пабудуем соцыялістычную гаспадарку і пролетарскую культуру на Беларусі.

Ус. Ігнатоўскі.

Дзяўчына--раўнапраўны таварыш.

У Дрыбіне гэта зразумелі.

Аляксандрыйцы-ж „таўкуць ваду ў ступе“.

Шыцьцё-грамата-фізкультура

(М-ка Дрыбін, Аршаншчына).

Дзеля правільнага скарыстаньня доўгіх зімніх вечароў па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі і жан'організатара быў утвораны гурток кройкі і шыцьця. Гэты гурток вельмі зацікавіў нашых дзяўчат і ў яго запісалася адразу 35 чалавек.

Для вядзеньня працы ў гуртку вылучылі двух комсамолак-краўцоў. Праца ў гуртку закіпела. Наведваньне заняткаў акуратнае. Няма ніводнага пропуску.

Акрамя таго, што дзяўчаты вучацца кроіць і шыць, яшчэ наладжваюцца і чыткі розных газэт і жаночых часопісяй.

Аднаго разу была праведзена на занятках гуртка гутарка аб значэньні фізкультуры. Дзяўчат гэта таксама зацікавіла і ўвесь гурток пастанавіў займацца фізкультурай. Заняткі ўжо праводзяцца.

Дашчэяў П.

ЯК МЫ ЎЦЯГНУЛІ Ў КОМСАМОЛ ДЗЯУЧАТ.

(Слабадзкая яч. ЛКСМБ, Горацкі раён, Аршаншчына).

Год таму назад Слабадзкая комсамольская ячэйка мела ў сваіх шэрагах толькі адну дзяўчыну. На гэта ненармальнае зьявішча бюро ячэйкі свасчасова зьвярнула ўвагу. Склікалі агульны сход, на якім быў пастаўлен даклад аб быце дзяўчат.

Пасьля абгаварэньня гэтага пытаньня быў абвешчан запіс у гурток рукадзельніцтва. Запісалася шмат дзяўчат.

Працай гэтага гуртку дзяўчаты вельмі зацікавіліся, бо побач з заняткамі па рукадзельніцтву праводзіцца і чыткі часопісі «Работніца і Сялянка» і інш. літаратуры.

Гурток пад кіраўніцтвам настаўніцы мясцовай школы наладзіў адзін досыць цікавы вечар.

Такая пастаноўка працы сярод дзяўчат нашай вёскі дала добрыя вынікі. Цяпер у нашай ячэйцы ўжо 14 дзяўчын.

П. Ш-ў.



Зьнішчым хворыя погляды

(Жлобін, Комсамольская ячэйка заводу «Дрэвааапрацоўнік»)

Нядаўна наша ячэйка склікала нараду дзяўчат-работніц, на якой прысутнымі дзяўчатамі адзначаліся:

— Мала ведаць, што дзяўчына—наш раўнапраўны таварыш, а трэба на справе ствараць спрыяючыя ўмовы для працы.

Часта хлапцы сярод дзяўчат трымаюць сябе па хуліганску. Такія адносіны трэба зжыць.

Практычнай працай, цікавай і неабходнай для дзяўчат, трэба павялічваць процант апошніх у шэрагах Ленінскага саюзу.

Бюро ячэйкі павінна сачыць за комсамольцамі і адзначаць іх памылковасьць у поглядах на дзяўчыну.

Нарада разварушыла Жлобінскіх дзяўчат, павялічыла іх актыўнасьць.

З. Бартошкін.

А У НАС... ЦІХА.

(В. Аляксандрыя, Капыскі раён, Аршаншчына).

Рост нашай ячэйкі ідзе галоўным чынам за лік дзяўчат. Але гэта не даказвае таго, што ў нас у ячэйцы пастаўлена добра праца сярод дзяўчат. Агульна-выхаваўчая праца стаіць на вельмі нізкай ступені і некаторыя дзяўчаты пачынаюць выхадзіць з комсамолу.

Партыйная ячэйка часта дае ўказаньні, як зьнішчыць такое зьявішча, але яны нешта ня прывіваюцца.

Трэба організаваць такія гурткі, у якіх дзяўчаты маглі-б набываць сабе веды і якія-б цікавілі іх, напрыклад, гурток кройкі, вязаньня, шыцьця і г. д. Калі гэта будзе зроблена, дык і дзяўчаты ня будуць выходзіць з комсамолу.

Чакалінскі.

За дзелавую, прыкладную працу!

Перавыбары сельсаветаў заканчваюцца.

Як мы правялі перавыбары саветаў

(Смалявіцкі раён, Менскай акругі)



Пытаньне аб перавыбарах сельсаветаў усе ячэйкі ЛКСМБ (за выключэньнем Шыпянскай) прапрацавалі па матарыялах пастаноў Ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП (рэзолюцыя па дакладу тав. Молатава) і азнаёміліся з інструкцыяй ЦВК аб перавыбарах саветаў.

Жодзінскай, Варатоўскай, Смалявіцкай і Верхменскай ячэйкамі былі праведзены сходы моладзі, на якіх комсамольцы-сельсаветчыкі рабілі справаздачы абгаварывалі пытаньне аб удзеле сялянскай і батрацкай моладзі ў выбарчай кампаніі.

На справаздачах сельсавету комсамольцы і моладзь актыўна выступалі, здарова крытыкавалі працу савету.

У гэтым годзе комсамольскія ячэйкі прымалі больш актыўны ўдзел у дапамозе партыі па працы сярод беднаты. У некаторых сельсаветах (Аз.-Слабоцкі-Забалоцкі) комсамольцы па даручэньню і пад кіраўніцтвам упаўнаважанага ад РВК і РК КП(б)Б самастойна праводзілі сходы беднаты дзе няма ячэяк КП(б)Б.

Амаль усіх комсамольцаў, якіх высоўвалі яч. ЛКСМБ у склад с-савету сходы беднаты таксама аднагалосна падтрымоўвалі.

На перавыбарчых сходах па раёну (за выключэньнем мястэчка Смалявіч) прысутнічала 100 проц. усіх ком-цаў.

Усяго па раёну мы маем у гэтым годзе 20 комсамольцаў, членаў с-с і 7 кандыдатаў, што складае 13—15 проц. усяго складу сельсаветаў.

У некаторых сельсаветах, як Жодзінскі, дзе летась працавала некалькі комсамольцаў і досыць добра гэты проц. значна большы (з 27 членаў і кандыдатаў с-с.—9 чалавек комсамольцаў) пры чым старшыня і сакратар гэтага савету комсамольцы.

Апрача гэтага мы яшчэ ў трох саветах маем старшынь сельсаветаў комсамольцаў (Верхменскі, Забалоцкі, і Азярыцка-Слабоцкі).

У трох саветах (з 11) сакратары сельсаветаў комсамольцы.

Галоўныя недахопы якія былі пры перавыбарах саветаў гэта—слабы ўдзел у гэтай працы Шып'янскай ячэйкі, якая амаль што нічога не зрабіла і Смалявіцкіх трох мястэчковых ячэек КСМ, дзе ком-цаў, як на справаздачных так і на выбарчых сходах прысутнічала толькі 50—55 проц.

Другі недахоп—у перавыбарнай кампаніі батрацкая моладзь, прымала слабы ўдзел.

М. Маслоўскі.

Каго выбіраем.

(З лістоў нашых юнвяскораў).

У гэтым годзе моладзь вёскі **Шчытамерычы, Сеньніцкага сельсавету**, ў перавабырах прымала актыўны удзел. Пры выбарах галасавала толькі за працаздольных людзей. Комсамольская ячэйка к гэтаму часу выпусьціла спэцыяльны нумар насьценнай газэты. У сельсавет прашлі надзейныя хлопцы.

Актыўны.

— (Петрыкаў, Мазырская акруга). Яшчэ за два тыдні да перавыбараў комсамольцы Беланавіцкай ячэйкі падрыхтавалі выбарчыя позвы, якія былі раздадзены сялянам за 4 дні наперад перавыбараў. На выбарчы сход зьявілася 55 процантаў усіх выбаршчыкаў.

У савет-жа з нашай вёскі абрана 3 сябры і 1 кандыдат. З іх 3 комсамольцы і адна дзяўчына-дэлегатка.

А. МАЛОЧНІК.

Перавыбарныя размовы

— Правалілі мы на выбарах свайго кулака: за яго толькі трэць была.

— Ну... а мы так свайго выбралі: за яго была «чвэртка».

* * *

— Ну, як у вас, сельсавет рыхтуецца да перавыбараў?

— Рыхтуецца. Старшыня ў акругу паехаў.

— За інструкцыямі?

— Ды не, па горкую.

* * *

— А старшыня ў вас хлапец абыходчывы.

— Пашукаць такога. Усе да аднаго законы абышоў і ні на адным не спатыкнуўся.

Трое. «Л.»

Ад такіх старшынь беднаце гора.

(Гатавінскі сельсавет, Заслаўскі раён).

На перавыбарах Гатавінскага сельсавету прысутнічалі шэфы з гораду.

Супроць дрэннай працы старога старшыні **Шляхцёнкі** выступалі сяляне, асабліва дапрызыўнікі.

Зазначалі, што Шляхцёнак кожны год перамярае зямлю і дае сваім любімчыкам. Апрача таго, ён і сабе здорава намерыў—**мае ўжо 23 дзесяцін**, а плаціць **падатку толькі за 18 дзесяцін**. Свае сенажаці мае 4 дзесяціны ды набраў яшчэ ў саўхозе.

Бедната засталася бяз сена, а Шляхцёнак не пасьпеў нават усяго пакасіць—частка зазімавала.

Усе казалі, што такіх старшынь нам больш ня трэба.

А. Бальшавік

Дзявочыя прыпеўкі.

У зялёненькім садочку
птушка залівалася.
У комсамол, ужо гадочак,
як я запісалася.

У гарадзе на градзе
капуста зялёная.
У комсамольскі клюб хутчэй
пабегу сягоньня я.

* * *

Ой гармонік песьнямі брызьні
і разлейся па сяле.
Дзе ні выйду, дзе ні гляну—
Усё-ж у клюбе весялей.

Ой, за садам у гародзе
сланечніку шышка.
Спадабаўся дужа мне
комсамолец Грышка.

Ой, віднее на двары,
сонейка узыходзіць
Моладзь нашая ужо
да царквы ня ходзіць.

Ходзіць певень па двары
пяе—ку-ку-рэ-ку!
Стары быт на селе
дажывае веку.

Дзіч.



„СИДИШЬ У КАМИНА“--ЗАМЕНІМ НАРОДНАЙ ПЕСЬНЯЙ.

ЯК ПРАШОЎ У ВОРШЫ ПЕРШЫ АКРУГОВЫ КОНКУРС ГАРМАНІСТЫХ.

Аршанскі конкурс выявіў, што гарманісты апрача „полькі“, „кракове“ больш нічога ня ўмеюць іграць. Наша задача акомсаоліць гармошачныя гукі.

Узьнятае «Чырвонай Зьменай» і ўсім комсамольскім друкам пытаньне ў мінулым годзе за аўладаньне гармонікам узьварушыла ўсе ячэйкі Аршанскай акругі.

5-га верасьня мінулага году комсамольская ячэйка в. Стаі, Круглянскага раёну па раеньню «Чырвонай Зьмены» запрасіла да сябе гарманістага. Гукі гармоніка пранізваючы сьцены новымі, праўда беднымі, нотамі, зусім цьвярозымі, шмат людзей прывабілі ў хату-чытальню.

У пярэмяшку з музыкай комсамольцы вялі гутарку з сялянамі на розныя тэмы. Гармонік здаў залік, апраўдаў надзею поўнасьцю, а гарманісты дзівіўся першай вечарынцы, якая прашла без самагону і бойкі.

Але не здабравалася апошняму. Хуліганьнё гэтай вёскі на чале з **Ф. Галаўковым** страціўшы гарманістага чакалі цэлую ноч і калі ён варочаўся да хаты пабілі яго за «здраду».

Гэта быў першы пачын барацьбы за гармонік.

Былі ў нас і такія выпадкі, калі злавіўшы «здрадзіўшага» гарманіста разьбівалі гармонік на шчэпкі.

АК комсамолу гэтакія хворыя выпадкі начау зьнішчаць стварэньнем грамадзкай думкі вакол гармоніку.

У мясцовай газэце «Комуністычны Шлях» зьмяшчалі артыкулы па гэтаму пытаньню. Пачалі дзе-ні-дзе наладжвацца нарады гарманістых. І ў рэшце, месяцы 3 таму назад, АК ЛКСМБ рашыў правесьці шэраг раённых, а потым і акруговы конкурсаў гарманістых.

Партыйныя і профэсыянальныя організацыі ня толькі адобрылі, такую думку але і дапамаглі ў гэтай справе. Конкурс адбыўся 4-га лютага.

ДОЎГА ЧАКАНЫ КОНКУРС

Раніцай трэцяга лютага па вуліцах Воршы красаваліся рознаколярныя афішы.

Акруговы конкурс гарманістых
За ўваход 10 кап.

Збор пашоў на карысьць марфлёту. Сабралі 23 рублі.

У куце вялікага пакою сабраліся маладыя хлопцы і дарослыя мужчыны з перакінутымі праз плячо гармонікамі. Сярод іх рабочыя хлапцы з заводу, сялянскія «мальцы» працаўнікі АК КСМ і АК КПБ.

Распачалі ў 7.

Кароценькі даклад аб ролі гармоніку ў культмасавай працы, а потым садаклады з месц.

КОМСАМОЛ І ГАРМОНІК—ТАВАРЫШЫ.

Асмалоўскі комсамолец Ляднянскага раёну.

У нашай вёсцы 120 двароў. Моладзі шмат. Раней бадзялася, як бяспрытульная б'ючы вокны, ды выбрыкваючы розныя няпрыемныя штукі.

Ячэйка комсамолу ўзялася вывесьці моладзь на сьветлы шлях. Пачалі моладзь заклікаць у хату-чытальню паслухаць газэту ці даклад, некаторыя ішлі, а іншыя не,—чакалі чаго небудзь прывабнага. На падмогу прышоў мой гармонік. Зьбіраемся ў хату-чытальню, перад чыткай газэт, альбо вечарам самадзейнасьці зайграю на гармоніку—моладзь мігам зьявіцца. Распачынаецца дзелавая праца, а потым сьпевы, гульні, скокі...

І вось з таго часу гармонік з комсамолам пасябравалі назаўсёды.

«ЧАГО НЕ ЦЯРПЕЎ НАШ БРАТ».

(Тав. Радомскі, Дубровенскі р.).

— «В. Чырына ляжыць далёка ад гораду і ад чыгункі. Культмасавая праца сяк так праводзіцца. Хуліганства яшчэ ня зьнішчана, нядаўна былі 2 выпадкі за бойства. Аднаго калом забілі, а другога нажом.

У нашай вёсцы 6 музыкантаў, якія конкурыруюць за грашовую і п'яную вечарынку.

Іх справа там, а мая з ячэйкай, у хаце-чытальні.

За гэта я 2 «пыткі» нядаўна адбыў, праўда малыя—2 разы стукнулі, як мае быць, але гэтым мяне не адвучыць ад карыснай справы. Пачалі мяне гарманістыя перацягваць на свой бок і аднаго разу калі я ішоў у хату-чытальню супынялі мяне: «Ідзём вып'ем, ня трэба граць дарам». Я, вядома, адмовіўся.

Гэтым я выклікаў на сябе злосьць.

Нават гармонікам мы і дзяўчат к сабе перацягнулі. Быў час калі адны дзяўчаты ішлі на нашу вечарынку, а другія на п'яную, а назаўтра пытаюць: дзе лепш—ці на комсамольскай, ці на прыватнай і калі ўбачылі дзяўчаткі, што на нашых вечарынках ня штурхаюцца, ня б'юцца, ня зьдзекуюцца, дык і ўсе да нас прышлі

«За гармошачную агітацыю»

Адзін за адным звыш 20 гарманістых паказвалі прысутным свае здольнасьці. Маркаў, Казлоў, рабочы Гузаў, Маскаленка, Ігуменаў, Мішчанка, Аўсянкін, Лясноў Кастрашін і шмат яшчэ іншых частавалі прысутных музыкаю.

Вясковая моладзь паказала, якія музычныя здольнасьці, якая каштоўнасьць хаваецца ў іх.

Лепшыя гарманістыя, што скарыстоўваюць свой гармонік у культурна-масавай працы і гарманістыя-самародкі (адзін з Горацкага раёну сам зрабіў «баян», нават надзвычайна добрага гатунку), атрымалі прэміі: 1—Ленінская бібліотэчка; 2—срэбраны гадзіньнік; 3—каса; 4—«Чырвоная Зьмена» на год (ад рэдакцыі газэты); 5—акруговая газэта «Комуністычны шлях»; 6—грамата. Апрача гэтага ўсе удзельнікі атрымалі прэміі.

Некалькі практычных вынікаў з конкурсу

Першая спроба Аршанскага Комсамолу прашла вельмі добра. Тлумачыцца гэта папершае тым, што не раптам, а загадзя пачалі рыхтавацца і другое, што камісія ў пераважнай большасьці была складзена з гарманістых.

У конкурсе прымалі ўдзел рабочыя, сяляне чырвонаармейцы і частка гарадзкіх музыкантаў. Пераважная большасьць была з вёсак.

Ігра музыкантаў падкрэсьліла, як далёка гармонік адстаў ад жыцьця. Сьведкай гэтаму зьяўляецца тая беднасьць матываў, якою ўзнагародзіла гармонік яго мінулае. Гармонік не пашоў яшчэ далей за «польку» альбо «Шумел горел пожар Московский»

Гэта адбыўшыйся конкурс адзначыў і па шляху зьнішчэньня гэтых недахопаў павінна пайсьці далейшая кіраўніцтва комсамолу гэтым музычным інструмантам.

І яшчэ падкрэсьліў гармонік—гэта сваю ролю, як організатара моладзі ў колектыў, і прыцягненьня дзяўчат да хаты-чытальні, да ячэйкі і тое, што праз гармонік вёска вучыцца разумець і цікавіцца больш удасканаленымі музычнымі інструмантамі.

У далейшай нашай працы з гармонікам трэба гэта мець на ўвазе

Ул. Паскрэбка.

У Маскву з кваліфікацыяй.

Паслан у Маскву на курсы загадчыкаў Біржы Працы асыстэнт Барысаўскай Інспэкцыі Працы **комсамолец Галецкі.**

Колькі броні?

На прадпрыемствах ВСНГУ БССР налічвалася на першае сьнежня 1926 году —1215 падлеткаў. З іх хлапцоў—725, дзяўчат—490.

Сярэдні процант колькасьці броні адносна ўзрослых рабочых складае 7,6.

Разбраніраваньне парасткаў.

У выкананьне дырактывы ВСНГ, ЦСПСБ і Наркампрацы, аб якой нядаўна абвяшчалася ў нашай газэце, **приступлена да разбраніраваньня пераросткаў на фабрыках і заводах.**

За апошні час на буйных прадпрыемствах **разбраніравана 20 проц. усіх пераросткаў,** якія цяпер пераведзены ў штат рабочых.

Колькі беспрацоўных падросткаў.

Як ведама, для беспрацоўных падросткаў, якія зарэгістраваны ў юнсэкцыі Біржы працы, былі ўстаноўлены 3 дні ў тыдзень дзеля яўкі (аўторак, чацьверг і субота). **Падросткі, якія не зьяўляліся ў юнсэкцыю ў гэтыя дні, зараз зьняты з вучоту.**

У сучасны момант на вучоце юнсэкцыі знаходзяцца **886 пераросткаў,** з якіх 120 комсамольцаў.

За апошні тыдзень, юнсэкцыя накіравала на працу ў лік броні (галоўным чынам у працколектыву) **12 падросткаў.**

Варта здароўя піонэраў.

З прычыны роспуску камісіі «Варта здароўя піонэраў» пры Чырвоным Крыжу, работу гэтай камісіі будзе выконваць камісія па садзейнічаньню фізкультурнаму піонэрскаму руху.

Адначасова пры ЦБ ЮП складаецца аздаравіцельная камісія пад старшынством **т. Брадоцкага.**

Нарада аб турызме.

20 лютага г.г. рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» сумесна з Вышэйшым Саветам фізкультуры БССР склікае шырокую нараду па пытаньням пролетарскага турызму і ўдзелу ў ім моладзі. Маецца на мэце організацыя ў Беларусі турысцага таварыства.

Масавыя турніры моладзі.

У сярэдніх лічбах лютага у Менску пачнуцца масавыя шахматна-шашачныя турніры працоўнай моладзі. Турніры будуць праводзіцца з мэтаю выяўленьня разьвіцця шахматна-шашачнага спорту сярод моладзі. Турніры організуе шахматна-шашачная сэкцыя ВСФКБ сумесна з ЦК ЛКСМБ.

Як стаць летчыкам.

У сакавіку Белавіахім праводзіць чарговы набор моладзі ў Ленінградзкую авіашколу.

Акруговыя камісіі павінны адабраць для адсылкі ў Смаленскую вайскова-адборачную камісію 32 кандыдаты.

Для паступленьня ў авіашколу патрабуецца: узрост 18—23 год, добрае здароўе і асьвета ня ніжэй 7-х годкі.

РОЎНА ПРАЗ 5 ДЗЁН

у Беларускім Дзяржтэатры адбудзецца першы спэктакль для рабочай і вучнёўскай моладзі, організаваны „Чырвонай Зьменай",.

Ячэйкі! Ці ідзеце вы у тэатр? Ці закупілі вы былеты?

Білеты кожны вечар прадаюцца ў клюбе імя КІМ у тав. Ароцкера. БІЛЕТЫ КАШТУЮЦЬ: крэсла 1—7 раду —75 кап.; 8—12 р.—60 кап.; бакавыя месцы 1 р.—60 кап.; 2 р.—50 к.; амфітэатр другога ярусу 1 і 2 рады—60 кап.; 3 р.—50 кап.; купон ў лёжу 1 яр.—60 кап.; 2 яр.—50 кап.; амфітэатр 3-га ярусу 1 і 2 рады—40 кап.; 3-4 і 5—30 к.; 3 ярус 1 р.—40 кап.; 2 і 3—30 кап. і стаяць—15 кап.

ШТО ГЭТА?

1920 год. Раз'юшаныя паны-акупанты спраўляюць свой крывавы бал. Нізка, нізка да зямлі прытуліліся вёскі, зьніклі ў зелені разьвесістых клёнаў, патанулі сярод сьпелых палёў. Захавалі крыўду і боль.

Ціха і сумна. Панскі бізун спраўляе сваю справу, але крыўды ня стрымаць. Мы пераможам! Мы вызвалімся. І вёска рыхтуецца да новага паходу, да новых падзей.

А пілсудчыкі гуляюць. Ім што? Давай пся крэў падаткі, давай апошняга капя! Бізун гуляе ва ўсю. Боль з агідаю вырываецца з старых трухлявых грудзей... «Сабакі... каты...»

Разам з пілсудчыкамі спраўляе свой баль заможная шляхта. Яна пачула сілу, яна пачула моц. Ёй здаецца, што так будзе заўсёды.

Скокі з шляхэтнымі паненкамі, гарачыя пацалункі, бліскучая зброя і надзеі пашырыць межы аж да Масквы—вось чым жывуць пілсудчыкі і багатая шляхта.

А вёска плача. Цяжка, ой цяжка гнуцца перад панамі, цяжка, ня вытрымаць. Рабочым жывецца ня лепей. 10-ці гадзінны працоўны дзень, пагромы «цывілізаванай» польскай арміі, нізкая зарплата, нарэшце голад і турма.

Завод працуе, але ціха, памалу, як-бы пад прымусам і, здаецца, кожны яго рух кажа—стану... стану і я...

Рабочых шкадаваць некаму, Лепей хай загіне дзясятак рабочых, чым улажыць дзясятак рублёў на рамонт паравога катла. І вось на заводзе—гучны ўзрыў. Ахвяры. Рабочыя застаюцца бяз хлеба і дапамогі.

А ў гэты час Чырвоная Армія наступае... Пілсудчыкі ўстрывожаны. Устрывожылася і панская шляхта. Сталі як цені сноваць чуткі, што ўжо нядоўга ім гуляць. Зараз... зараз...

— Цёмная, цёмная ноч. У шэрым тумане, у мільгаценьні мільёнаў агнёў, пад грымоты гармат, разгортваецца польскі фронт. Чырвоныя націскаюць, яны ўсё бліжэй і бліжэй. Польскія варты перадаюць тэлеграмы аб адступленьні іх арміі. І гэтыя гукі ў казачнай чароўнай ночы здаюцца далёкімі, далёкімі і западаюць у істоту...

Фронт прарваны, а тыл ва ўсю гуляе. Скокі, заліхвацкая п'янка з паненкамі, упэўненасьць у непераможнасьці...

Дзікі, разьдзіраючы душу сыгнал. Яго гукі льлюцца трывожна і балюча, узбуджаюць пачуцьці, узбуджаюць настроі.

І вёска пачула гэтыя гукі з прыемнасьцю, з надзвычайнай асалодай. Кінулі кліч усім паднявольным: за зброю!..

Чырвоныя мерным крокам падыходзяць бліжэй і бліжэй. Польскія паны з'організоўваюць банды Балаховіча, каб даць адпор чырвоным. Але ўжо позна.

Мы з вамі ня пойдзем!—кажуць сяляне.

Дзесьці недалека чутны стралы. Ужо лятаюць у паветры першыя птушкі—чырвоныя самалёты. А сыгнал бяз перапынку вядзе свае заміраючыя гукі, перапоўненыя жалем.

Заварушылася шляхта. Уцякаць з Саўдэпіі—адзін ратунак. Заварушыліся і папы і ксяндзы, усе тыя, хто пражджаў на вясковай беднаце.

— Абрусом вам шлях!—кажуць сяляне.

Чырвоныя падыходзяць да Менску. Уцякае апошні эшалён пілсудчыкаў.

А ў горадзе пагромы, пажары, глум, пагарда, сьмерць. Але гэта апошні баль.

Чырвоныя сьвяткуюць перамогу! Пачалося будаўніцтва краіны. Загудзелі аднаўленыя ўласнымі рукамі рабочых заводы і фабрыкі. Сяляне мірна працуюць на сваіх палёх і разам з рабочымі будуюць вялікую краіну саветаў.

* * *

Чытач зьдзіўлены: дзе гэта адбываецца?

А гэта, таварышы, ты ўбачыш у сераду, 16-га лютага ў Беларускім Дзяржаўным Тэатры на спэктаклі «Перамога».

Сьпяшайся ў клюб КІМ за білетамі!

М. Хведаровіч.

Запытаньні і адказы.

Запытаньне № 797 (Ц. П). Ці прымаюць цяпер дабравольцаў у Чырвоную Армію?

Адказ. Ня прымаюць.

Запытаньне № 798 (Х.). Ці мае права голасу на комсамольскіх сходах комсамолец, які яшчэ не зацьверджан райкомам.

Адказ. Ня мае права.

Запытаньне № 799 (Верабей). Ці можна паставіць на від сакратару комсамольскай ячэйкі, калі ён часта сварыцца з комсамольцамі.

Адказ. Можна. Трэба аб гэтым паставіць пытаньне на пасяджэньні бюро ячэйкі.

У тры радкі:

Сямейныя вечары з інсцэніроўкамі аб працы Менгорсавету праводзіць ЦСПСБ у часе перавыбарнай кампаніі.

Дзеля ўзмацненьня фонду дапамогі бяспрытульным дзецям, паштовае ведамства выпусьціла новыя маркі ў 20 кап.

96 хворых сялян-беднякоў. пасылае ў гэтым годзе Нар.Кам.Аховы Здароўя БССР на курорты Крыму і Каўказу.

160.000 дзес. плошчы БССР пераводзіць на шматпольле Наркамзем у 1927 г. (павялічэньне супроць 1926 г. на 30 проц.).

Лыжная станцыя (на 30 пар лыж) адчынена ў Барысаве пры рабочым клюбе. Гэтымі днямі адбудзецца лыжны прабег Барысаў—Ворша.

ПЕРШАЯ КАЛЁНІЯ.

Першая калёнія адпачынку рабочай моладзі на 50 чал. організуецца ўлетку Нар, Кам. Аховы Здароўя БССР у Слуцкай акрузе.

„Вялікія ідыёты" вытворчасьці Белдзяржкіно,

ці аб чым сумуе містэр Дройд.

Супроць масавай пропаганды... няпісьменнасьці

Чакаем адказу Белдзяржкіно!

Беларускія надпісы ў кіно-стужках выпуску Белдзяржкіно—рэч, бязумоўна, добрая і карысная. Тут з аднаго боку, тым, якія ведаюць беларускую мову, прадстаўляецца магчымасьць сачыць за ходам стужкі на роднай мове, а з другога—тыя якія мову ведаюць слаба, на кіно-стужках могуць павучыцца ёй.

Адзін таварыш нават выказаўся так:

— Лекцыі беларускай мовы я бяру ў кіно...

Але на жаль прыходзіцца адзначыць, што справа па беларусізацыі кіно-стужак выпуску Белдзяржкіно знаходзіцца ў вельмі дрэнным становішчы.

Каб падкрэсьліць гэтыя словы прывядзем некалькі фактаў.

Вось у стужцы «**Г а м б у р г**» чытаем надпіс парасійску: «...Сюзи **пошла**», а вышэй пераклад на беларуску: «...Сузі **пашоў**...».

У гэтай-жа стужцы далей чытаем парасійску: «...**Больной** идиот...» і пераклад: «...**Вялікі** ідыёт...».

Такім чынам здаецца Белдзяржкіно ўдалося адным рухам рукі і «больного» і «вялікага» ідыёту вырашыць пытаньне, якое займае ўжо многа год галавы вялікіх вучоных сьвету,—пытаньне якое вецца—«скрещение полов».

Далей... У стужцы «**Укразия**» ба[...] надпіс: «...Містер Дройд «**голодал**» і [...]раклад: «...Містэр Дройд **сумаваў**...».

Яно так! Як-жа не сумаваць міст[эру] Дройду, калі сыты галоднага не разу[мее]. Містэр Дройд хоча есьці, а Белдзярж[кіно] піша, што ён сумуе!..

Можна прывясьці яшчэ шмат пры[кла]даў падобных адносін Белдзяржкіно да [бе]ларусізацыі кіно-стужак. Ня рэдка за[мест] беларускіх слоў у надпісах ужываю[цца] расійскія, ёсьць шмат памылак і г. д.

І ня дзіва будзе цяпер, калі падо[йдзе] да мяне таварыш, які бярэ лекцыі бе[ла]рускай мовы ў кіно і скажа:

— Я вельмі **сумны**, дай мне **есьці!**

Ці падойдзе да якой небудзь дзяў[чы]ны з словамі:

— Ты чаго сёньня не **пайшоў** сход?

Дарагія таварышы з Белдзяржк[іно]. Адна ў нас толькі да вас просьба. **пушчайце вы на экран надпісы «б[о]ных ідыётаў».** Сумна робіцца. Су[...]

Мік. Таўба[...]

„Без'языкі" загаварыў

Нарэшце, тое, да чаго імкнулася чалавецтва столькі гадоў, — ажыцьцёвілася: **кіно загаварыла**. Праўда, першыя крокі гаворачага кіно няспрытныя, некаторыя гукі чуюцца слаба, музыка таксама ня зусім ясная; затым злучэньне гука з карцінай дасягнута толькі ў часе, г. з. адначасова з узьнікнавеньнем карціны гаворыцца адпаведнае слова, **але не ў прасторы**. Гукі чуюцца адкульсьці з боку, а ня з вуснаў гаворачых.

Але **гэтыя недахопы**, трэба думаць, з цягам часу **будуць зьнішчаны**.

Думка аб стварэньні гаворачага кіно ўзьнікла ўсьлед за вынаходжаньнем кінематографа. Яшчэ ў 1895 годзе **Эдысонам** быў выпушчан у сьвет яго «**кінетафон**», які ўяўляе са-бою злучэньне кіно-апарату з фонографам. Але гэтае злучэньне ня было зусім удалым, так як словы часта не супадалі з дзеяньнем, бывалі такія выпадкі, калі па ходу гульні трэба было сказаць нешта вясёлае, а «кінетафон» наадварот гаварыў сумнае ці маўчаў. Зразумела, што кінетафон ня мог доўга ўтрымацца.

Доўгія гады пасьля гэтага чалавецтва білася над проблемай гаворачага кіно, але толькі ў апошнія часы, у сувязі з агульным разьвіцьцем фізыкі і ў прыватнасьці электротэхнікі, **удалося разьвязаць гэтую задачу. Дастаткова сказаць, што для стварэньня гэтага кіно прышлося тром вядомым спэцыялістым у працягу 8 год бяссупынна і ўпарта працаваць.** І ў выніку гэтай упартай працы ім нарэшце ўдалося пабудаваць гаворачае кіно, якое мае назву «Тры эргоны», што вызначае па грэцкі—праца трох.

Як-жа адбываецца **процэс фотографаваньня гукаў?** А вось як:

Тут як у тэлефоне, гук праізносіцца ў так званае «**электрычнае вуха**», якое перарабляе яго ў слабы электрычны ток. Гэты ток выклікае сьвячэньне асобнай лямпачкі. І вось пры фотографаваньні якой небудзь сцэнкі, **гукі, якія раздаюцца ў часе гульні, прымушаюць сьвяціцца гэтую лямпачку.** Фотографічны апарат фіксіруе пэрыодычныя зьмяненьні сьвету лямпачкі. **Такім чынам атрымоўваецца фотографічная запіс гуку.** Гэты запіс абазначаецца на краю кіно-плёнкі ў выглядзе цэлага шэрагу рысак—цёмных і сьветлых, рознай таўшчыны і разьмеркаваньня—а сярэдняя частка плёнкі занята звычайнай фото-карцінай.

Пры дэмонстрацыі гаворачага кіно неабходна ператварыць рыскі краю плёнкі ў гукі. Для гэтай мэты фільма асьвятляецца асобнай лямпай. Праменьні сьвету, праходзячы праз рыскі фільмы, падаюць на асобны апарат, які завецца «**электрычным вокам**». Гэтае «вока» ў сваю чаргу ператварае праменьні сьвету ў электрычнасьць, а затым пры дапамозе тэлефону асобнай конструкцыі электрычнасьць ператвараецца ў гукі, якія і чутны ў залі!

Мы з нецярпеньнем чакаем таго моманту, калі «вялікі-без'языкі» загаварыць ува ўсіх гарадох нашага саюзу.

П—оу,

Нарада па пытаньню вайсковай працы ЛКСМБ.

У нядзелю, 13 лютага, у 11 га[дз]ін ран., у будынку фойэ Дому Асьветы (Комуністычная вул.) рэд. газ. «**Чырвоная Зьмена**» разам з вайсковай камісіяй ЦК ЛКСМБ і Менскім акругкомам ЛКСМБ, склікае нараду па пытаньню «**Вайсковая праца комсамольскіх ячэек**».

Абвестка дню наступная:

1) Даклад ячэек тэкстыльшчыка (Горраён), фабзавуч скурнікаў (Ляхаўка), шляхоў МББ (Акцябраўка) і вайсковага гуртка клюбу КІМ—а[б] пастаноўцы вайсковай працы.

2) Даклад камісіі па абсьледваньню вайсковай працы гэтых ячэек гуртка клюбу КІМ.

На нараду запрашаюцца: **працаўнікі гарадзкіх ячэек па сатаварыству, сакратары комсамольскіх ячэек (па выкліку райкому, апоргі комсамольскіх груп вайсковых частак, сэкратары РК, сябры бюро АК, сябры прэзыдыуму Авіяхіму ОСА, юнкоры,** а таксама пэрсанальна наступныя таварышы: **Трыгубэнкаў, Лакцыёнаў, Зайцаў, Маневіч,** профэса[р] **Бэркенгэйм, Фрэйдзін, Астроўс, Заяц, Шэвялоў, Коцікаў.**

Запрашаюцца прыняць удзел [у] нарадзе таварышы, якія цікавяцца вайсковай працай.

РЭДАКЦЯ ГАЗ. «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА». ВАЕНКАМІСІЯ Ц[К] ЛКСМБ. МЕНАКРУГКОМ ЛКСМБ.

Апавяшчэньн[і]

Суд на музыкай.

У суботу. 12 лютага, а 9 гадзіне [ве]чары, у клюбе КІМ адбудзецца грам[адзкі] суд над музыкай, організаваны юнсэк[цыяй] Дому працасьветы.

Суд мае мэтай высьвятліць, якая [му]зыка больш патрэбна нашай моладзі.

Пасьля суду—концэртная частка. [Бі]леты можна атрымаць у клюбе.

Да ўвагі сяброў ячэйкі пр[ац]асьветы.

У суботу 12 лютага, а 8 гадзіне [ве]чары, ячэйка працасьветы наладжвае [ве]чар спайкі.

Вечар адбудзецца у Доме Працась[веты]. Прысутнасьць усіх сяброў ячэйкі—аб[авяз]кова.

Згублены:

— Кандыдацкая картка ЛКСМБ № [...] выд. Менскім АК на імя Рузава А.

— Комсамольскі сяброўскі білет, [выд.] Менакругкомам на імя А. Гальдрэя.

З вуліцы.

Зайдзеце ў памяшканьне камісіі па барацьбе з бяспрытульнасьцю, пры Менскім Акрана. Там вы ўбачыце шмат абарваных хлапцоў, якіх не сягоньня—заўтра камісія накіруе ў **прыёмнік для бяспрытульных.**

Прыёмнік зьяўляецца першай інстанцыяй, куды паступаюць бяспрытульныя дзеці. Адсюль яны праз некаторы час разьмяркоўваюцца па дзіцячых дамох.

У сучасны момант у гэтым невялічкім будынку знаходзіцца 44 дзяцей самага рознастайнага ўзросту — ад 7 да 17 гадоў. Ня менш рознастайны і іх нацыянальны склад: расійцы, татары, палякі, беларусы (апошніх—большасьць).

Чаго ня перажылі, не гледзячы на сваю моладасьць, усе выхаванцы прыёмніку, дзе яны толькі не перабывалі! Перш чым папасьці сюды, кожны з іх шмат пакутваў, іспытаў голад, холад і інш. Бяспрытульныя з усіх канцоў СССР—Масквы, Сібіры, Адэсы, Севастопаля і г. д...

У прыёмнік кожны бяспрытульны падвяргаецца індывідуальнай апрацоўцы, якая мае мэтай зьнішчыць у яго ўсе дрэнныя, вулічныя звычкі: курэньне, лаянку, варaўство. Замест гэтага прывіваюцца новыя карысныя навыкі,

Ня гледзячы на ўсе стараньні выхавацеляў, 50 проц. знаходзячыхся ў прыёмніку зьяўляюцца яшчэ праванарушыцелямі, здольнымі на дробныя пакражы і інш. дзеяньні. Зразумела, што за кароткі тэрмін немагчыма ператварыць праванарушыцеля ў культурнага і сьвядомага чалавека. Гэта дасягаецца толькі паступова.

Як сябе адчуваюць бяспрытульныя на новым месцы?

Вельмі дрэннае ўражаньне робіць на іх кепскае абсталяваньне прыёмніку, кепскае матар'яльнае становішча апошняга (недахоп вопраткі, абутку, ложкаў і г.д.). Ёсьць дзеці, якія зусім ня маюць верхняга адзеньня і ходзяць у аднэй бялізьне. Усё гэта тлумачыцца адсутнасьцю сродкаў.

Кармленьне ў прыёмніку—здавальняючае. Раніцаю—гарбата з малаком і хлебам; днём—абед з двух-трох страў; вечарам—зноў гарбата ці што небудзь іншае.

У прыёмніку існуе самаабслугоўваньне і самакіраўніцтва. Дзеці самі прыбіраюць памяшканьне, мыюць падлогу і інш. Самакіраўніцтва выяўляецца ў выглядзе існаваньня гэтак званага дзяткому, які абіраецца на агульным сходзе. Дзятком сочыць за дысцыплінай і парадкам, кіруе працай камісій: санітарнай, гаспадарчай і бялізнавай.

Кожны дзень у вызначаны час выхавацелі праводзяць гутаркі, чыткі газэт і кніжак. Некаторыя выхаванцы ходзяць у школу. Кожны тыдзень дзеці наведваюць кіно-тэатр. Але няма ў прыёмніку ніякіх гурткоў, бібліотэкі і наогул масавая праца кульгае.

Трэба адзначыць, што сярод выхаванцаў прыёмніку існуе вялікая цяга да рамесцтваў і наогул фізычнай працы.

Акрана нядаўна адпусьціла 375 руб. на абсталяваньне сталярнай майстэрні, якая будзе адчынена ў самым хуткім часе.

Ляхоўскае райбюро ЮП прымацавала да прыёмніку піонэрскі атрад, дзеля сатаварыства. Можна спадзявацца, што піонэры здолеюць аказаць на выхаванцаў належны ўплыў і дапамогуць ім стаць сумленымі і сьвядомымі грамадзянамі савецкай краіны.

Я. Зэльцар.

Адказныя рэдактары: **А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.**

Галоўлітбел № 23989. 2 Дзяржрукарня БДВ.